# ГОСЦІКІ ДАРАГІЯ

**29 красавіка офіс Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі наведалі студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы на чале з выкладчыкам, кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам кафедры беларускай філалогіі, літаратуразнаўцай, літаратурным крытыкам Алінай Эдмундаўнай САБУЦЬ.**



Перад студэнтамі 2 курса спецыяльнасці «Руская філалогія» выступілі члены СПБ – паэтэса Вольга Алізар і паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык. Мадэратам сустрэчы стала Аліна Эдмундаўна Сабуць, член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь (намінацыя «Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства»). Пісьменніца, даследчык, педагог акрэсліла напрамкі гутаркі ў межах універсітэцкага спецыяльнага курса па вывучэнні сучаснай айчыннай літаратуры.




Дзмітрый Мікалаевіч Радзівончык пазнаёміў гасцей з гісторыяй і сённяшнім днём Саюза пісьменнікаў Беларусі, яго структурай, некаторымі асаблівасцямі і функцыямі. Літаратар, супрацоўнік адміністрацыі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ больш падрабязна спыніўся на літаратурным жыцці Прынёманскага краю і дзейнасці пісьменніцкай арганізацыі Гродзеншчыны, запрасіў моладзь да супрацоўніцтва і ўдзелу ў шматлікіх конкурсах, прэзентаваў некалькі кніг сваіх калег, расказаў аб калектыўных рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных праектах з удзелам ГрАА СПБ.

Вольга Сцяпанаўна Алізар *(на фота)* знаходзіцца ў шэрагах Саюза пісьменнікаў Беларусі не так даўно. Тым не менш, паэтцы, аўтару некалькіх паэтычных зборнікаў і шматлікіх публікацый у перыядычным друку заўсёды ёсць што сказаць моладзі, а самае галоўнае – што прадэкламаваць з уласнага творчага багажу. І гэта адбылося на сустрэчы – паэтка агучыла нядаўна апублікаваны ў папулярнай газеце «Літаратура і

мастацтва» аўтарскі цыкл малітваў. Да гучных чытанняў далучыўся і паэт Дзмітрый Радзівончык. Творца прапанаваў свае паэтычныя пераклады і прачытаў адзін з твораў на рускай мове. А потым гучалі пытанні ад гасцей, якім хацелася шмат чаго даведацца ў прымаючага боку: падрабязнасці творчага працэсу, што трэба для пачатку пісьменніцкай дзейнасці, неабходныя ўмовы для ўласнай рэалізацыі, крыніцы натхнення і г. д. Пісьменнікі адказвалі шчыра, аргументавана, змястоўна. Запрасілі юных даследчыкаў літаратуры на афіцыйны Інтэрнэт-сайт Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, на якім таксама можна знайсці нямала каштоўнай інфармацыі. Аліна Эдмундаўна даручыла студэнтам у пісьмовай форме выказаць свае рэфлексіі ад сустрэчы з гродзенскімі творцамі. У фінале ўсіх жадаючых чакала фотасесія на памяць.

Нагадаем, што такія сяброўскія сустрэчы студэнтаў ГрДУ імя Янкі Купалы і пісьменнікаў сталі традыцыяй. Дарэчы, слова «традыцыя» падчас мерапрыемства гучала неаднаразова. Як ключавы фактар існавання мастацтва слова і навукі пра яго. Як сакральная каштоўнасць, дастойная працягу і развіцця. А дасягаецца ўсё гэта толькі сумеснымі намаганнямі – у Саюзе аднадумцаў. Таму канструктыўны дыялог з моладдзю, пабудаваны на традыцыі, узаемнай сімпатыі, зацікаўленасці, пісьменнікамі ва ўсе часы вельмі цэніцца. Спадзяемся, што гэта ўзаемна.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На фота:** офіс Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі наведалі студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы (2 курс, спецыяльнасць «Руская філалогія»). 29 красавіка 2026 года.



**А. Э. Сабуць**



**Д. М. Радзівончык**






ПАДЗЯКА










Нёман
№ 12 · 2025
Литературная строка
Дзмітрый Радзівончык
МАСТЫ І БЕРАГІ
Дмитрий Радиончик
НАВСТРЕЧУ ПОПУТНОМУ ВЕТРУ
НИКОГДА
РЫЦАРИ СЛОВА
Вольга АЛІЗАР
Я дачка сінявокай краіны
Вершы
№ 7 2022
НА НЁМАНСКАЙ ХВАЛІ
Літаратурны альманах
Вольга АЛІЗАР
У ІМЯ ПЕРАМОГІ
Вершы, эсэ
Галіна Антонава
ВАЙНА Ў АСОБАХ
Непрыдуманыя гісторыі герояў

